ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1989
ЧАЦВЕР
7
СНЕЖНЯ
№ 33 (1626)

ЖУРФАКУ — 45 ГАДОЎ

ТАК ТРЫМАЦЬ!

На журфаку свята. Выкладчыкі, студэнты, супрацоўнікі адзначаюць 45-годдзе факультэта. Як і звычайна ў такіх выпадках, падводзяць вынікі, аналізуюць недахопы, намячаюць план на будучае. Менавіта аб гэтым вялася размова на святочнай канферэнцыі, якая прайшла на факультэце журналістыкі.

Выступаючы на ёй, дэкан факультэта, прафесар А. Г. Слука акрэсліў уклад факультэта ў справу падрыхтоўкі кадраў, прычым, не толькі для Беларусі, але і для замежных краін — сёння ужо каля 200 студэнтаў-замежнікаў атрымалі творчы дыплом.

Горача віталі ўдзельнікаў канферэнцыі госці — былыя студэнты факультэта, зараз вядомыя журналісты: уласны карэспандэнт «Правды» А. Уліцёнак, уласны карэспандэнт «Сельской жизни» В. Леганькоў, намеснік рэдактара «Вечернего Минска» А. Гарбачоў, намеснік рэдактара часопіса «Крыніца» Л. Екель, галоўны рэдактар маладзёжнай рэдакцыі Беларускага радыё Н. Чайка. «Так трымаць, родны факультэт!» — вось лейтматыў кожнага выступлення.

Асабліва ўсхваляваным і шчырым было выступленне першага дэкана факультэта, доктара гістарычных навук, прафесара Рыгора Васільевіча Булацкага. Безумоўна, у тым, чаго дасягнуў журфак сёння, ёсць і яго заслуга.

Пасля адкрыцця канферэнцыі пачалі працаваць секцыі пры кафедрах. 45-годдзю факультэта прысвяціла сваю выстаўку Ліванская зямляцтва.

ШАРЛЬ МАЙЕКУ,
студэнт IV курса міжнароднага аддзялення факультэта журналістыкі.

Фота А. МАЖАРЫ.

СПАДЧЫНА

Дзякуй за роднае слова!

Я ўпэўнены, сапраўдную асалоду зведалі тыя, хто прыйшоў на свята беларускага слова — сустрэчу з тэатральнай студыяй «Летуценнік». Гэта сябрына сапраўды захопленых, улюбёных у беларускае слова людзей. Большасць з іх — студэнты філфака, але ёсць і тыя, хто, скончыўшы універсітэт, не парывае сувязі са сваім тэатрам. Напрыклад, на Юру Хітрага нават яго вучні прыйшлі паглядзець.

Студыяй вось ужо колькі гадоў кіруе апантаны, шчыры прапагандыст беларускай мовы дацэнт кафедры беларускай літаратуры Маргарыта Барысаўна Яфімава.

...Гучала са сцэны іскрыстае, непаўторнае купалаўскае слова. «Летуценнікі» умеюць вымавіць яго так, каб людзі заслухаліся мілагучнасцю і вобразнасцю, каб захацелі яго паўтарыць. І аўдыторыя, якая ў большасці сваёй была рускамоўнай, з захапленнем успрымала кожны каларытны народны жарт, прымаўку. Галоўнае ж — адчувала сапраўднае, народнае слова — менавіта такое з вялікім імпэтам нясе нам са сцэны «Летуценнік». Дзякуй яму за гэта!

В. ЦЫГАНКОЎ,
студэнт факультэта журналістыкі.

ШТО НОВАГА? ШТО НОВАГА?

ВЫРАШЫЎ САВЕТ

ВОПЫТ НЕ ЗА ГАРАМІ

«З мэтай удасканалення педагагічнай падрыхтоўкі студэнтаў разгледзець магчымасць стварэння на факультэтах, што рыхтуюць настаўнікаў школ, кабінетаў прыватных методык»,— менавіта так сфармуляваны адзін з пунктаў пастановы вучонага савета БДУ імя У. І. Леніна. Былі і іншыя. Члены савета, напрыклад, рэкамендавалі дэканам факультэтаў, на якіх ёсць педагагічныя патокі, шырэй выкарыстоўваць вопыт, назапашаны некаторымі падраздзяленнямі універсітэта ў арганізацыі бесперапыннай педагагічнай практыкі студэнтаў. За прыкладамі далёка хадзіць не трэба. Варта звярнуцца на фізічны і геаграфічны факультэты. У гэтым плане ў іх ёсць чаму павучыцца. Безумоўна, вопыт патрабуе не толькі пераймання, але і ўдасканалення. Таму абагуліць яго даручана кафедры педагогікі.

І яшчэ адзін аспект у педагагічнай падрыхтоўцы студэнтаў закрануты на апошнім пасяджэнні вучонага савета. Звернута ўвага вучэбнага аддзела, кафедры педагогікі на неабходнасць распрацаваць тыпавы дагавор на падрыхтоўку кадраў, заключаемы паміж органамі кіравання народнай адукацыяй і універсітэтам.

З. МІХНЕВІЧ.

ІНФОРМБЮРО

На кантроль!

З мэтаю забеспячэння незалежнага механізму вырашэння спрэчных пытанняў і палажэнняў у БДУ імя У. І. Леніна створана кантрольная камісія, якая дзейнічае паралельна з камітэтам камсамола і падпарадкоўваецца толькі камсамольскай канферэнцыі.

Камісія мае права:

— уздымаць пытанне аб скліканні пазачарговай камсамольскай канферэнцыі ў выпадку неабходнасці;

— выносіць на абмеркаванне камітэта камсамола універсітэта любое пытанне студэнцкага і камсамольскага жыцця;

— часова прыпыняць рашэнні камітэта камсамола, якія супярэчаць праграме дзеяння, прынятай на канферэнцыі, і выносіць іх на дадатковае абмеркаванне камітэта камсамола, пярвічных камсамольскіх арганізацый;

— прымаць удзел ва ўсіх грамадска-палітычных і культурных мерапрыемствах універсітэта.

Кантрольная камісія з'яўляецца калегіяльным органам.

Кіраўніцтва камісіяй ажыццяўляюць пяць састаршыняў.

Д. МАЛІНОЎСКІ.

Пачалі работу

групы «Здароўя» для супрацоўнікаў універсітэта па наступных відах спорту: атлетычная гімнастыка, дзюдо, валейбол, усходнія віды спорту, плаванне — для мужчын і жанчын, баскетбол — толькі для мужчын. Калі вы таксама пажадаеце стаць стройнымі і здаровымі, звярніцеся на кафедру фізічнага выхавання і спорту.

Т. ДОЎНАР.

МІМАХОДАМ

Вечар пяцікурсніка

А ці ведаеце вы, што адбылося ў мінулую пятніцу? Хутчэй за ўсё, акрамя студэнтаў юрыдычнага факультэта, пра гэта ніхто і не чуў. А адбылася вельмі цікавая падзея — вечар пяцікурсніка, які прайшоў у Палацы культуры МВТА імя Кісялёва. Прысутных чакала цікавая праграма: віншаванні ад выкладчыкаў і студэнтаў з іншых курсаў, дыскатэка, а самае галоўнае — выдатны настрой. Пяцікурснікам хутка правяраць свае веды на практыцы, а гэты вечар са студэнцкага жыцця ім запомніцца надоўга.

А. МАЖАРА.

ПРАГНОЗ НА ЗАЎТРА

Акцэнт на «нефармальныя» гутаркі

Камсамольская вучоба ў нашым уяўленні часта не прадстаўляе сабой нічога жывога. Упэўнены, удзельнікі трохдзённай вучобы камсамольскага актыву факультэтаў універсітэта ў Маладзёжным турысцкім цэнтры «Юнацтва» могуць з гэтым не пагадзіцца. У праграме вучобы былі: прэс-канферэнцыя з прадстаўнікамі камітэта камсамола універсітэта, сустрэча з работнікамі рэктарата і парткома, «круглы стол» па пытаннях міжнароднай і ўнутранай палітыкі краіны. З паведамленнем аб правах і абавязках студэнтаў выступіў студэнт юрыдычнага факультэта Ян Фунг. Вядома ж, не абыйшлося і без студэнцкай дыскатэкі.

Асноўную карысць ад гэтай вучобы мы бачым у больш блізкім знаёмстве і «нефармальных» гутарках паміж калегамі па камсамольскай рабоце, якая таксама не засталася ўбаку на пасяджэннях нашых секцый па сектарах камітэта камсамола.

А. РУСАКОВІЧ,
намеснік сакратара камітэта камсамола БДУ.

ТЫСЯЧА І АДЗІН РЭЦЭПТ

Гульня для ўсіх

Аб чарговай гульні клуба вясёлых і знаходлівых усе ведалі задоўга да яе пачатку. І на гэты раз каманды імкнуліся, каб у зале не было ніводнага абыякавага твару. Нават строгае журы не-не ды весела смяялася.

Пасля двух гульняў выйграе каманда студэнтаў БДУ. Яна, як і астатнія члены клуба, скрыжавала свае шпагі з гаспадарамі сцэны у гэты вечар — студэнтамі інстытута культуры. Ох, як цяжка ім давялося! Але ім можна ўжо перавесці дыханне, а наступнай камандзе рыхтавацца да ролі «гаспадыні». Дык пажадаем жа нашай камандзе паспяхова закончыць гэту гульню.

М. АНДРЭЕЎ.

НЕ ПРАМІНІЦЕ!



А абсталявання на аднаго студэнта ў нас у краіне на 2,4 тысячы рублёў (для параўнання: 80 тысяч долараў у ЗША). І інтэрнатамі забяспечаны толькі 78 працэнтаў, але пакуль памаўчым пра якасць. Да таго ж, па дадзеных сацыёлагаў, прыкладна палову студэнтаў не задавальняе ўзровень выкладання гісторыі КПСС і навуковага камунізму.

І ў той жа час 64 працэнты студэнтаў 35 ВНУ краіны называюць гультайства сваім звычайным баўленнем часу, а 30 працэнтаў выкладчыкаў лічаць, што ўсе цяжкасці перабудовы выкліканы безадказнасцю студэнтаў (між іншым: з 2259 студэнтаў, адлічаных з Ленінградскага універсітэта за пяць гадоў, толькі 32 (1,4 працэнта) пакінулі ВНУ з-за матэрыяльных цяжкасцей. Большая частка — 56,2 працэнта адлічаны за акадэмічную непаспяховасць).

Крызіс наспяваў. Пачуцці накаляліся. Невырашальныя пытанні прыспешвалі. Складзіся перадумовы студэнцкага форуму. Ці не выглядала несвоечасовай дадзеная рэвалюцыя ў сістэме вышэйшай адукацыі?

У сярэднім на дзесяць выступленняў гучала адно канструктыўнае — неперадузятае сведчанне настойлівых сацыёлагаў не абвяргае сумненні аднаго з дэлегатаў: «Наш узровень кампетэнтнасці, на жаль, не адпавядае ўзроўню абмяркоўваемых праблем...»

Верыць ці не верыць у форум?

У вас ёсць магчымасць праверыць правільнасць сваіх разважанняў. Чытайце ў наступным нумары інтэрв'ю з дэлегатам Усесаюзнага студэнцкага форуму, студэнтам юрыдычнага факультэта Уладзімірам ХВАЛЕЕМ.

ШТО НОВАГА? ШТО НОВАГА? ШТО НОВАГА?

ДА 500-ГОДДЗЯ Ф. СКАРЫНЫ

«Ко познанию мудрости и наказания»

«Без мудрости и без добрых обычаев не есть мощно почтиве жити людям посполите на земле»,— не сумняваецца Ф. Скарына ў вялікай карысці эстэтычнага выхавання. У анатацыі да першага раздзела кнігі «Прытчы Саламонавы» (1517 г.) асветнік не прамінае закрануць пытанні выхавання падрастаючага пакалення, педагогікі. Асобныя раздзелы «Прытчаў Саламона» расказваюць «о чадех, како имает отец научати их», «о научении сына». Характарызуючы першы ўсходнеславянскі падручнік — «Азбуку», выдадзеную першадрукаром Іванам Фёдаравым у 1574 годзе, акадэмік Н. М. Ціхаміраў называў аўтара «прадвеснікам гуманнай педагогікі». Хіба не пра Скарыну гэтыя ж словы, не пра тыя прытчы, што выкладзены ім?

«Кто з мудрыми ходит, мудр будет, друг же безумных подобен им есть»; «Пути мудрости суть путие красны и вси стези суть мирны»; «Прмежи гордыми всегда суть свары, и кои все дела советом чинят, в тых есть мудрость»; «Кто чужое берёт, своё приложит к тому»; «Мудростию соделывается дом и умением укрепляем бывает. Научением наполняются погребы, всякого добра драгого и прекрасного. Муж мудрый силен есть, а муж наученый есть крепок и моцен».

Што цяпер векавыя чалавечыя дабрадзейнасці: сумленне, прыстойнасць, спагада? Балюча, але шматгадовае зневажанне агульначалавечых, гуманістычных каштоўнасцей ператварыла іх у непатрэбныя рэчы. Крыўдна, але новую гуманную педагогіку мы пакуль толькі праектуем.

Пачнём з падмурка?

Падрыхтавала
М. СТАТКЕВІЧ.
Фота А. МАЖАРЫ.

ЗНАЁМЦЕСЯ: КШЫШТАФ ДАМАГАЛА

ЧАМУ НЕ ПРАЎДЗЯЦЬ СНЫ?

Калі хлопчыку споўнілася пяць гадоў, ён марыў стаць лётчыкам. Жаданне гэта было настолькі моцным, што ў сне ён заўсёды бачыў сябе за штурвалам самалёта, які, нібы птушка, распраміўшы крылы, лунаў у паднябессі. Але сон канчаўся, а мара так і заставалася марай. Напэўна, таму, што чакаць яе ажыццяўлення, нарэшце, надакучыла, ён аддаў перавагу іншай прафесіі — ваеннаслужачага. Ды і гэта ненадоўга. Потым падабалася быць урачом.

На жаль, у жыцці атрымалася так, што ніводная мара дзяцінства не стала яваю. Наадварот, прафесія, якую ён зараз набывае, далёкая ад тых юнацкіх памкненняў.

Кшыштаф ДАМАГАЛА — студэнт III курса факультэта журналістыкі. Праўда, шлях у журналістыку ў яго таксама быў няпростым і ў нечым нагадваў дзіцячыя мары. Да паступлення ў БДУ ён закончыў аўтамабільны тэхнікум, авалодваў спецыяльнасцю юрыста і толькі пасля заканчэння падрыхтоўчых курсаў у Варшаўскім універсітэце быў накіраваны ў Мінск, у Белдзяржуніверсітэт.

Праляцелі першыя гады вучобы, з'явіліся першыя ўражанні. Безумоўна, не ўсё задавальняе студэнта ў працэсе навучання. Не разумее ён, напрыклад, чаму выкладчыкі будуюць свае лекцыі, спасылаючыся толькі на выказванні К. Маркса, Ф. Энгельса, У. І. Леніна? Хацелася б падрабязна пазнаёміцца і з тэорыямі буржуазных вучоных, каб мець не толькі агульнае ўяўленне, але і магчымасць самім параўнаць гэтыя вучэнні, знайсці ў іх рацыянальнае зерне, нарэшце, у нечым прыняць ці абвергнуць.

Асабліва падабаюцца Кшыштафу тыя прадметы, якія непасрэдна звязаны з будучай работай. Ён не толькі вучыць тое, што неабходна па праграме, але і цікавіцца дадатковай літаратурай па тэорыі і практыцы журналістыкі. Праўда, спачатку гэта давалася цяжка — перашкаджаў моўны бар'ер. Але паступова К. Дамагала пераадольваў яго, усё лепш авалодваючы рускай мовай. Дапамагала ў гэтым і практыка. Пачынаў, як і ўсе студэнты, з падрыхтоўкі вучэбных перадач у факультэцкай тэлестудыі, зараз спрабуе наладзіць кантакты з беларускім тэлебачаннем.

Якія ж праблемы хвалююць будучага журналіста сёння? Аб чым ён збіраецца гаварыць са сваімі гледачамі і слухачамі?

— Найбольш блізкія мне зараз студэнцкія праблемы, — заўважае К. Дамагала.— Але нельга закрываць вочы і на тыя палітычныя, сацыяльныя, эканамічныя пытанні, што хвалююць сёння кожнага паляка і ад вырашэння якіх залежыць лёс студэнцтва.

Так, Кшыштаф Дамагала сапраўды не застаецца безудзельным да студэнцкіх праблем. Яшчэ сам студэнт, ён ужо думае аб тым, як палепшыць матэрыяльнае становішча тых, хто вучыцца, дапамагчы ім вырашыць фінансавыя праблемы. Добра было б, напрыклад, адкрыць відэакафэ, арганізаваць турыстычныя базы, дзе студэнты працавалі б у вольны ад вучобы час. А самая запаветная мара — стварыць клуб журналістаў, дзе можна было б абмяняцца думкамі, паспрачацца ці проста пасядзець з калегамі-землякамі за кубкам кавы.

...У дзяцінстве ён вельмі любіў марыць. Відаць, гэта іскрынка летуценніка і сёння не дае яму быць абыякавым.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

«ГОНТЛІД» — «БЕЛАРУСКАМУ УНІВЕРСІТЭТУ»

Спорт разам з адпачынкам

Універсітэт Калгары ў многім абавязаны зімовым Алімпійскім гульням 1988 года. Спартыўныя збудаванні, што засталіся пасля Алімпіяды на тэрыторыі універсітэта, служаць у асноўным студэнтам, якія актыўна імі карыстаюцца. Тут размешчаны новыя хакейныя пляцоўкі, дарожкі для бегу на каньках, а таксама нямала спартыўных тэрапеўтычных клінік і памяшканняў для кантролю за вагой.

Гэтыя збудаванні выкарыстоўваюцца ў адпаведнасці з праграмай Дэпартамента фізічнай культуры, які носіць назву «Спорт разам з адпачынкам». Гэта праграма дазваляе студэнтам гуляць, напрыклад, у хакей, прычым, плата намнога ніжэй, чым яна была б для звычайнага чалавека.

Некаторыя іншыя забавы, якія таксама падабаюцца студэнтам, носяць не настолькі здаровы характар. Універсітэт мае некалькі піцейных дамоў, дзе студэнты могуць расслабіцца, дзякуючы размове з сябрамі і алкаголю.

Гэтыя ўстановы даволі папулярныя. У той час, як у такіх жа ўстановах, але размешчаных па-за тэрыторыяй універсітэцкага гарадка, часта бываюць бойкі, універсітэцкія бары, такія як «Дзініс Дэн» практычна не сутыкаюцца з данай праблемай.

Адзін з бараў прапануе па пятніцах канцэрты і выступленні артыстаў, а два іншыя маюць вялікія відэаэкраны, на якіх дэманструюцца рок-канцэрты. Універсітэт кантралюе работу бараў і атрымлівае даход ад продажу алкагольных напіткаў на тэрыторыі універсітэта.

Дэвід ГАЗАРД (Канада).

Фотатлумачэнне: зусім не абавязкова выбірацца на трэніроўку ў горы. Універсітэт Калгары мае дзве сценкі для заняткаў альпінізмам: пад адкрытым небам і ў крытай зале.

Фота «ГОНТЛІТ».

РОДНАЯ МОВА Ў БДУ

ЯК ГЭТА БЫЛО...

Вялікая Кастрычніцкая рэвалюцыя паклала пачатак новай эры ў гісторыі нацыянальных узаемаадносін, асновай якіх стала ленінскае патрабаванне абсалютнага раўнапраўя ўсіх нацый і моў:

Раўнапраўе нацый і нацыянальных моў аб'явіла «Дэкларацыя правоў народаў Расіі», прынятая ў першыя дні Савецкай улады. Гэтае ж палажэнне і ў далейшым пацвярджалася важнейшымі праграмнымі дакументамі партыі і дзяржавы.

У сакавіку 1923 года XII Усебеларуская партыйная канферэнцыя заявіла, што партыя павінна ўзяць на сябе актыўнае кіраўніцтва ў цэнтры і на перыферыі па няўхільнаму развіццю работы на мясцовых мовах. Пленум ЦК КП(б)Б у ліпені 1924 г. прыняў рашэнне аб стварэнні найбольш спрыяльных умоў для развіцця і ўжывання беларускай мовы «з тым, каб з фармальна раўнапраўнай зрабіць яе фактычна раўнапраўнай».

Нягледзячы на цяжкае эканамічнае становішча, недахоп кадраў інтэлігенцыі, некаторыя хістанні людзей у адносінах да сваёй роднай мовы і інш., рэспубліка ўзялася актыўна перабудоўваць духоўную сферу дзейнасці. Улічваючы ўсё гэта, другая сесія ЦВК БССР (15 ліпеня 1924 г.) паклала пачатак планаваму ажыццяўленню беларусізацыі як дзяржаўнай палітыкі. Праграма беларусізацыі ўключала ў сябе арганізацыю навучальных устаноў на беларускай мове, развіццё і далейшае пашырэнне беларускай літаратуры, выданне беларускіх кніг, навукова-даследчую працу па ўсебаковаму вывучэнню Беларусі, перавод партыйнага, дзяржаўнага, прафсаюзнага, кааператыўнага апарату на беларускую мову і інш. Устанаўліваліся і канкрэтныя тэрміны завяршэння гэтага працэсу. Напрыклад, беларусізацыю апаратаў Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта і Савета Народных Камісараў БССР, Наркамземлясобства рэспублікі планавалася завяршыць за адзін год, наркаматаў унутраных спраў, юстыцыі, сацыяльнага забеспячэння, пошты і тэлеграфа — за два, а ўсіх астатніх устаноў і арганізацый — за тры гады.

Беларусізацыя як практычнае ўвасабленне прынцыпаў суверэннага развіцця нацыі была адным з найбольш значных, вырашальных фактараў, якія абумовілі станаўленне беларускай савецкай культуры і рост свядомасці народа, яна далучыла да культурнага і палітычнага будаўніцтва мільёны людзей. У гэтых умовах асабліва значэнне надавалася развіццю беларускай літаратурнай мовы, якая паўнапраўнай гаспадыняй ўваходзіла ва ўсе сферы дзейнасці беларускага народа.

У працэсе беларусізацыі ў 20-я гады асабліва значэнне надавалася Белдзяржуніверсітэту, многія выкладчыкі і супрацоўнікі якога актыўна ўключыліся ў гэтую работу.

Ад БДУ як аднаго з важнейшых асяродкаў нацыянальнай навукі і культуры ў многім залежыў далейшы лёс беларускай мовы. Менавіта тут, а таксама ў створаным у 1922 годзе Інстытуце беларускай культуры (Інбелкульце), былі сканцэнтраваны асноўныя навуковыя сілы мовазнаўцаў і літаратуразнаўцаў, якія ў многім прадвызначалі лёс і далейшае развіццё роднага слова. Таму з такой увагай сачылі ўсе за правядзеннем беларусізацыі ў БДУ, тэрмінам заканчэння якой быў вызначаны 1929 год.

5 красавіка 1928 года на пасяджэнні Нацыянальнай камісіі ЦВК БССР быў заслуханы даклад аб беларусізацыі ў БДУ. Чытаючы рэзалюцыю па гэтаму дакладу, не перастаеш думаць, што вельмі многае з тых праблем 60-гадовай даўнасці зараз паўтараецца. Праўда, на больш высокай ступені грамадскага развіцця. Аднак асноўныя клопаты 20-х гадоў сугучны сённяшнім намаганням грамадскасці. Каб пераканацца ў гэтым, дастаткова ўважліва пазнаёміцца і прааналізаваць некаторыя дакументы той пары. Мяркуйце самі (тэкст прыводзіцца з захаваннем стылю арыгінала):

Рэзалюцыя, прынятая на пасяджэнні Нацкамісіі ЦВК БССР ад 5 красавіка 1928 года па дакладу аб беларусізацыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта і зацверджаная прэзідыумам ЦВК БССР 21 чэрвеня 1928 г.

1. Заслухаўшы даклад Праўлення БДУ аб беларусізацыі ва Універсітэце, Нацкамісія ЦВК БССР адзначае, што ў правядзенні беларусізацыі Універсітэта зараз маюцца наступныя дасягненні:

а) дасягнут пералом у настроях прафесуры і навуковых працаўнікоў Універсітэта ў сэнсе практычнага правядзення беларусізацыі ў навуковай іх працы;

б) павялічана колькасць гадзін выкладання дысцыпліны на ўсіх факультэтах на беларускай мове;

в) маюцца поспехі ў справе прасоўвання на вышэйшыя навуковыя пасады працаўнікоў-беларусаў; так, за тры апошніх гады з 11 чалавек навуковых працаўнікоў-беларусаў прасунута на вышэйшыя пасады 7 чал.;

г) ёсць дасягненні ў справе беларусізацыі студэнцкіх арганізацый; студэнцкія арганізацыі і актыў у большасці ўжываюць у сваёй працы беларускую мову.

2. Разам з тым Нацкамісія адзначае наступныя цяжкасці і недахопы ў справе беларусізацыі БДУ:

а) недастарчальны тэмп правядзення беларусізацыі БДУ, што выклікае пагрозу невыканання пастановы сесіі ЦВК аб тэрмінах беларусізацыі ўстаноў па прафесіянальна-тэхнічнай асвеце;

б) абмяжованасць колькасці навуковых працаўнікоў, якія маглі б выкладаць на беларускай мове;

в) фармальныя адносіны некаторай часткі навуковых працаўнікоў да вывучэння беларускай мовы і да пераводу выкладання сваіх дысцыплін на гэтую мову;

г) наяўнасць нерашучасці сярод некаторай часткі навуковых працаўнікоў (якія ўжо беларускую мову ведаюць) да пераводу выкладання на беларускую мову;

д) наяўнасць сярод некаторай часткі студэнцтва нежадання ўжываць беларускую мову;

е) непаўната беларускай навуковай тэрміналогіі, у выніку гэтага недахоп тэрмінаў, патрэбных для практычнай работы БДУ, таксама недахоп падручнікаў на беларускай мове.

3. Для паглыблення беларусізацыі БДУ і знішчэння ўсіх недахопаў і цяжкасцей у гэтым напрамку ў далейшым неабходна:

а) мабілізаваць усю грамадскасць БДУ вакол пытання беларусізацыі;

б) Праўленню БДУ для пашырэння існуючых дасягненняў праводзіць і надалей рашучую лінію ў справе намечаных мерапрыемстваў па беларусізацыі, узмацніўшы тэмп яе правядзення з такім разлікам, каб абавязкова ў тэрмін выканаць пастанову II Сесіі ЦВК БССР VI склікання аб поўнай беларусізацыі БДУ да 1929 г.;

в) Наркамасветы і Праўленню БДУ прыспешыць выкананне пастаноў ураду БССР аб папаўненні кадраў навуковых працаўнікоў беларусамі як шляхам далейшай падрыхтоўкі і прасоўвання мясцовых навуковых працаўнікоў, гэтак сама і шляхам запрашэння гэткіх з іншых савецкіх рэспублік;

г) павялічыць колькасць аспірантаў-беларусаў, для чаго даручыць Наркамасветы распрацаваць гэтае пытанне і ўнесці на зацвярджэнне адпаведных органаў;

д) з мэтай далейшай арацоўкі беларускай навуковай тэрміналогіі, даручыць Праўленню БДУ ўвайсці ў сувязь з Інбелкультам і прыняць меры да ўцягнення ўсіх навуковых працаўнікоў у гэтую працу;

е) даручыць Наркамасветы і Белдзяржвыдавецтву скласці план выдання на беларускай мове неабходных падручнікаў для БДУ (шляхам выдання новых падручнікаў, а таксама перакладу з іншых моў) і прыступіць да выдання гэтых падручнікаў;

ж) пры прыёме студэнтаў у Універсітэт звярнуць асаблівую ўвагу на веды беларускай мовы;

з) студэнцкім арганізацыям загастрыць пытанне аб актыўным удзеле ўсіх студэнтаў у практычным правядзенні беларусізацыі ў БДУ і неадкладна ўсю масавую працу сярод студэнцтва на беларускую мову;

і) даручыць Праўленню БДУ прыняць меры да таго, каб навуковыя працаўнікі, якія ў той ці іншай ступені ўладаюць беларускай мовай, у сваіх зносінах з студэнтамі карысталіся ёю, а таксама каб тыя навуковыя працаўнікі, якія ўжо перайшлі на беларускую мову, паглыблялі і паляпшалі свае веды беларускае мовы».

І яшчэ. Тым, хто захоча больш падрабязна азнаёміцца з працэсам беларусізацыі ў 20-я гады, прамовамі партыйных і дзяржаўных кіраўнікоў Беларусі, артыкуламі і рэзалюцыямі па нацыянальнаму пытанню, рэкамендую звярнуцца да кнігі «Два гады нацыянальнай работы ў БССР» (Мінск, 1929).

М. ПРЫГОДЗІЧ,
дацэнт філалагічнага факультэта.

ЛІСТ АДЧАЮ

Галодны няхай пачакае



Часопіс ЦК КПБ «Политический собеседник» у кастрычніку гэтага года апублікаваў актуальны матэрыял аб каранях і зброі бюракратыі, аб метадах яе праяўлення ў сучасных умовах. Сярод іх: замоўчванне, валакіта, адпіска, перадача скаргі таму, хто вінаваты ў злоўжыванні ці парушэнні, ускладванне адказнасці на іншую асобу, безыніцыятыўнасць, чаканне ўказанняў «зверху», паператворчасць, адміністраванне, боязь галоснасці, імкненне даказаць неадпаведнасць патрабаванняў, адмаўляць справядлівасць патрабуемага знізу, нежаданне лічыцца з думкай простых людзей...

Цалкам праявіліся ўсе гэтыя добра адпрацаваныя метады ў бюракратычнай кухні БДУ імя У. І. Леніна пры вырашэнні такога гуманнага і неадкладнага пытання, як арганізацыя «пункта харчавання» у корпусе геаграфічнага факультэта.

Здавалася б, не патрабуе доказаў факт, што калі калектыў студэнтаў і супрацоўнікаў налічвае тысячу чалавек ды яшчэ шматлікую армію студэнтаў-завочнікаў і іншых катэгорый, якія таксама вучацца ў корпусе, то нехта павінен паклапаціцца аб тым, каб гэтыя людзі не галадалі, не бегалі ў пошуках сталоўкі ці буфета ад аднаго корпуса да другога, а ў выніку напаўнялі свой страўнік піражкамі, купленымі ў антысанітарных кіёсках на вакзале.

Добрае, паўнацэннае харчаванне — залог высокай працаздольнасці. Гэта ісціна таксама не патрабуе доказу.

Аб якой эфектыўнасці вучобы можа ісці размова, калі 90 працэнтаў студэнтаў не снедаюць, а потым 6—8 гадзін праводзяць на занятках, якія часта змяняюцца кансультацыямі, сходамі, пасяджэннямі, а ў час сесіі — залікамі. У такім жа напаўгалодным стане знаходзяцца і выкладчыкі, што працуюць у гэтым корпусе універсітэта.

Колькі намаганняў прыкладзена «хадакамі» з факультэта ў прафком, рэктарат, партком, санэпідэмстанцыю і іншыя інстанцыі, колькі страчана часу, сіл, нерваў, здароўя, а сотні галодных па-ранейшаму чакаюць з надзеяй на гуманізм кіраўніцтва, галоўны абавязак якога — стварыць нармальныя ўмовы працы.

Калі б сабраць разам усе аргументы, заяўкі, каштарысы і іншыя акты паператворчасці, якія за многія гады назапасіліся вакол гэтага важнейшага гаспадарчага пытання, атрымаўся б наглядны дапаможнік па бюракратызму.

Адзін прарэктар раіў: «Ідзіце абедаць у Дом урада, я ж туды хаджу». Другі прапанаваў пацясніцца і вызваліць памяшканне. Вызвалілі, і не адно, але яны імгненна запаўняліся арміяй адміністрацыйна-гаспадарчых работнікаў. Дастаткова прыгадаць, што будучы старшынёй прафсаюзнага камітэта супрацоўнікаў, Г. В. Мацвееў хоць рабіў выгляд, што імкнецца выканаць прынятую тады пастанову парткома і рэктарата аб адкрыцці буфета ў корпусе геафака. Але варта было змяніць прафсаюзнае крэсла на іншае, як паважаны дэкан завочнага факультэта стаў галоўным праціўнікам амаль даведзенага да вырашэння пытання, спасылаючыся на тое, што з-за суседства з буфетам у яго рабочым кабінеце будзе шумна.

А як камфартабельна абсталяваны апартаменты прарэктара і ўсёй адміністрацыйна-гаспадарчай службы. Чаму б не пацясніцца каму-небудзь з іх дзеля здароўя моладзі? Кожны начальнік думае пра сябе і нікому няма справы, як жыць і вучыцца на галодны страўнік першакурсніку, які дабіраецца з прыватнай кватэры на першую пару заняткаў. Яму, напэўна, і ў галаву не прыходзіла, што толькі ў сталічным універсітэце такія цяжкасці з харчаваннем, таму што ў вясковай школе заўсёды было наладжана не толькі гарачае, але і бясплатнае харчаванне, ды яшчэ і бацькі клапаціліся аб гэтым. А тут няма ні таго, ні другога. Вось чаму праз пяць гадоў вучобы — гастрыты, язвы, анямії і іншыя хваробы ў тых, хто яшчэ не пачынаў працаваць.

Асабіста мне соромна глядзець у вочы гэтым студэнтам, няёмка ісці на заняткі і патрабаваць ад іх выдатных ведаў, калі мы, дарослыя, не можам стварыць ім спрыяльных умоў для вучобы.

Адстойваць інтарэсы калектыву маўчком, як паказаў дзесяцігадовы вопыт, безвынікова, тым больш, што кіраўніцтва мяняецца, а нявырашаныя пытанні застаюцца. Мне соромна і за тых камуністаў, якім даверылі распараджацца матэрыяльна-тэхнічнымі, фінансавымі і іншымі рэсурсамі універсітэта з адной мэтай: каб гэтыя рэсурсы служылі чалавеку — тым, хто вучыцца і хто вучыць. Дык чаму ж калектыў павінен іх прасіць, угаворваць ці патрабаваць рабіць тое, што неабходна па закону? Чаму яны могуць дазволіць сабе не выконваць гэтыя просьбы? Вось ён, аўтарытэт члена партыі на канкрэтным рабочым месцы, ад рэктара да дэкана, ад сакратара парткома да старшыні прафкома.

А між іншым, наш калектыў асаблівы. У ім пераважае моладзь, якая вучыцца ў нас не толькі спецыяльнасці, але і чалавечнасці, гуманнасці, дысцыпліне, арганізаванасці, вучыцца даваць слова і стрымліваць яго.

Б. МАНАК,
дацэнт.

АД ПЕРШАЙ АСОБЫ

Так і танцуем

— Падрыхтаваліся! Галава! Погляд на мяне. Рукі ў падрыхтоўчай пазіцыі. Пачалі!

Гукі вальса напаўняюць залу, дакранаюцца рук, прымушаючы іх злёгку ўздыхнуць і рухацца, зліваючыся з мелодыяй. Колькі разоў гэта ўжо было? Галава, погляд, пазіцыі, пліе, тандзю, батманы...

Музыка зайграла хутчэй. Здаецца, яшчэ крыху і ўсё, сіл не хопіць.

— Твар на мяне. Дзе ўсмешка?

Вось! Самае галоўнае: усмешка. Няхай сабе цяжка, і сілы на зыходзе, і недзе там, за парогам рэпетыцыйнай залы, чакаюць асабістыя праблемы і хваляванні. Забыцца на ўсё! Інакш, навошта тады танец? І дзеля чаго?

Танец прыносіць радасць! Гэта не проста прыгожыя словы. Паверце мне і праверце. Зазірніце як-небудзь на канцэрт фальклорнага ансамбля танца «Харошкі», а калі ўжо зусім пашанцуе, абавязкова наведайце канцэрт Дзяржаўнага ансамбля танца СССР пад кіраўніцтвам І. Маісеева. І вы не пакінеце залу абыякавымі. Радасць, якая хваецца за ўсмешкамі артыстаў, лёгка перальецца цераз край сцэны і запоўніць залу.

І ў буднях універсітэцкага народнага ансамбля танца «Крыжачок» заўсёды ёсць свята — сустрэча з гледачом. У Мінску ансамбль знаёмы многім, ён трывала ўваходзіць у лік лепшых самадзейных танцавальных калектываў рэспублікі. Не выпадкова ў гэтым годзе ансамблю прысвоена званне лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола Беларусі.

Цяжка пералічыць усе паездкі, сустрэчы, гарады, дзе пабываў «Крыжачок». Удзельнікі культурных праграм Алімпіяды-80 і XII Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Маскве, пастаянны госць свята песні і танца студэнтаў прыбалтыйскіх рэспублік «Гаўдэамус». Майстэрству акцёраў апладзіравалі ў гарадах і вёсках Беларусі, Украіны, Літвы, Карэліі. Паездкі за мяжу, апошнімі з якіх былі гастролі ў Ісландыю і ГДР. Рэспубліканскія агляды і фестывалі, гала-прадстаўленне ў Палацы спорту і на стадыёне, дзе «Крыжачок» працуе нароўні з прафесійнымі калектывамі.

...Рэпетыцыя працягваецца. Гэта толькі на сцэне лёгка і весела, а тут адно і тое ж многа раз. Аблізваеш салёныя ад поту вусны. І зноў скачкі, вярчэнні, камбінацыі з танцаў, якія выконваеш ужо не адзін год. Думаеш, толькі б дацягнуцца да абруса, але не паспяваеш.

— Яшчэ раз спачатку! Бягом!

Ужо многа гадоў існуе «Крыжачок», і на ўвесь гэты час рэпетыцыйнай стала для яго спартыўная зала універсітэта. Так вось і танцуем сярод матаў і спартыўных снарадаў, марачы пра люстраную залу з паркетнай падлогай; асобную раздзявалку (каб без спартсменаў, затое з душам); прафілакторый, у якім можна было б разам правесці выхадныя дні ці летнія месяцы, спалучаючы адпачынак з рэпетыцыямі.

Танцоры наогул народ цярплівы. Ім не прывыкаць да цесных і халодных памяшканняў, да цягнікоў другога сорту, цвёрдых аўтобусаў на далёкія адлегласці, скаргаў блізкіх і родных на тое, што рэдка бываем дома. Усё гэта страчвае сэнс і вастрыню, калі дзяўчаты папраўляюць грым, пераглядваюцца са сваім адлюстраваннем у люстры і хаваюцца за кулісамі, каб праз некалькі хвілін, забыўшыся на ўсё, несціся ў танцы лёгка і свабодна, адорваючы гледачоў сваімі ўсмешкамі і прывабнасцю.

Т. ЗАГНІЙ,
удзельніца народнага ансамбля «Крыжачок».

САКРЭТ ФІРМЫ

Выручалка для мам

Мам-студэнтак іншых ВНУ не без падстаў напаткае выключна чорная зайздрасць — у інтэрнаце Тбіліскага медыцынскага інстытута адкрыты дзіцячы садок. Выгода выключная. Інтэрнат знаходзіцца побач з вучэбнымі корпусамі — гэта раз. «Беспрацоўныя» студэнты плаціць за садок не будуць — два. Трэцім студэнткі-маці абавязаны дэмаграфічнай секцыі пры камітэце камсамола. Гэта яе ідэі аб стварэнні спецыяльнай кніжкі дзіцяці, якая мае сілу дакумента і замяняе стос даведак, звязаных з мацярынствам. Толькі жанчына можа аціць кніжку, што вызваляе ад чаргі за даведкамі ў жэках, паліклініках, ды і ў дэканатах таксама. Яна ж — своеасаблівы каталізатар у час вырашэння пытання аб прадастаўленні графіка здачы экзаменаў і залікаў.

М. ДЖАШЫ.

ЦВЯРОЗАСЦЬ — НОРМА ЖЫЦЦЯ

АНТЫБАХУС

РЭЦЭПТ

Пры Пятры I п'яніцам, якія трапілі ў турму, вешалі на шыю чыгунны медаль вагою ў 17 фунтаў (каля 7 кг) з надпісам «За п'янства»).

МІЖ ІНШЫМ

Французскія даследчыкі-эканамісты пісалі: «Алкаголь напаўняе палову нашых прытулкаў для звар'яцелых і амаль поўнасцю нашы турмы; ён павялічвае на 25—30 працэнтаў агульную смяротнасць, дае 50 працэнтаў пакутуючых ад туберкулёзу; алкагалізм бацькоў павялічвае на 50 працэнтаў смяротнасць дзяцей; п'янства вядзе да вынішчэння нацый».

Балгарскі вучоны Георгій Яфрэмаў у адной са сваіх работ прывёў звесткі аб 23 алкаголіках, ад якіх нарадзілася 15 мёртвых дзяцей і 8 калек.

НУ І НУ!

Чалавек стаў ахвярай «зялёнага змія» задоўга да свайго паяўлення. Схільнасць да спіртнога дасталася нам у спадчыну ад жывой прыроды. Гэта пацвярджаюць выпадкі п'янства сярод жывёл, птушак, насякомых.

Мурашы нярэдка прымаюць пад дах сваёй хаткі маленькага жучка-ламехуза. Ніякай карысці такое сумеснае жыццё мурашніку не дае. Наадварот, ламехузы, апетыту якіх можна пазайздросціць, здараецца, ласуюцца мурашамі ці іх яйкамі. Але ўсё гэта праходзіць для іх дарма, таму што яны заўсёды гатовы падставіць мурашам трыхомы, вільготныя валаскі, якія мураш прагна аблізвае. Выдзяленні на валасах — наркотык для мураша. І бедны мураш, налізаўшыся, забываецца на ўсё. У хуткім часе ён не можа ўжо рухацца. Калі многа такіх мурашак-наркаманаў — з лічынак, якіх дрэнна кармілі, выйдуць мурашкі-калекі, гняздо аслабне і знікне.

Насякомыя-наркаманы, як і людзі, страчваюць «пачуццё адказнасці за свае ўчынкі». Працаздольныя пчолы, прызвычаіўшыся да алкаголю, забываюць пра свае абавязкі: яны ўсе часцей лётаюць «пахмяліцца» і перастаюць збіраць мёд.

Вельмі агрэсіўна паводзяць сябе і свінні, якія падпілі. Пачуўшы пах спіртнога, яны гатовы знесці дзверы вінакурнага завода.

Пад уздзеяннем вінных пароў страчваюць міралюбнасць слоны. Работнікі запаведніка імя Кругера ў Паўднёвай Афрыцы кожны год хвалююцца, калі падаюць з дрэў мараэлы, спелыя кісласалодкія хмельныя плады. Гэта любімы ласунак жыхароў парка — слоў, якія, з'еўшы незлічоную колькасць хмельных ягад... п'янеюць. Аднойчы п'яны слон накінуўся на рабочага-афрыканца, які праязджаў побач, хобатам зваліў яго з веласіпеда на зямлю.

Выпадкі п'янства сярод жывёл доўгі час вывучаў амерыканскі ўрач М. Пруіт. Ён ведаў сабак, якія бегалі з бара ў бар, жабраючы глыток віскі.

У адрозненні ад жывёл чалавек можа аціць, якую шкоду прыносіць яму алкаголь. Чалавек разумны павінен зразумець, што ад гэтай спадчыны даўно настаў час адмовіцца.

Падрыхтаваў да друку
Г. УЛАДЗІСЛАВАЎ.

ЗАВОЧНАЯ ШКОЛА СТЭНАГРАФІІ

Таямніца знакаў Д і Л

Пачнём пяты ўрок. Калі нехта «адсутнічаў» на чатырох папярэдніх, не трэба страчваць надзею: у нашай школе вольнае наведванне. Давядзецца, праўда, больш хуткімі тэмпамі вывучаць заданні, змешчаныя ў нумарах 28, 29, 31, 32 «Беларускага універсітэта», каб дагнаць астатніх...

Па знешняму выгляду можна вылучыць некалькі груп стэнаграфічных знакаў.

Якія вострa пачынаюцца:



Т В М К П С

Якія вострa канчаюцца:



Т В М

Якія пачынаюцца пятлёй:

Л Д

Якія заканчваюцца закругленнем:



К П С Л Д

А зараз паспрабуйце знайсці адказ на загадку знакаў Л і Д. Было так: тры групы сфарміравалі па росту.



М С Л Т К Д В П

Усё тут было зразумела. Але вось літара Д перайшла ў другую групу, а Л — у першую:



М С Л Т К Д В П

Па якой прыкмеце зараз сфарміраваны групы?

Калі глядзець па знешняму выгляду (як пачынаюцца і заканчваюцца літары), то тут самая сапраўдная неразбярыха. І з вышынёй знакаў няма ніякага парадку.

І ўсё ж такі ёсць тут пэўная заканамернасць. Заўважыць яе цяжка, вочы тут дрэнны памочнік. Рука хутчэй адчуе, у чым прычына. Калі пачнеце пісаць гэтыя знакі — першую групу, другую, трэцюю — можа і знойдзеце адказ на хітрую загадку.

Урок вёў Уладзімір ГЕРАСІМАЎ.

АЎДЫТОРЫЯ № 7

УСПАМІН

«Беларусь мая снілася мне...»

«ЛІМ», «Праца», «Советская Белоруссия», «Знамя юности», «Чырвоная змена», «Голас Радзімы», «Ніва» пішуць пра яго. Пра дваццаць гадоў чакання і паўтара месяца спраўджаных надзей.

Дык хто ж ён, Данчык?

Па бацьку — украінец, па маці — беларус, па веравызванню — уніят. Першыя вершы, якія прачытаў для запісаў на магнітную стужку ў шэсць год, былі творамі Я. Купалы. Першай любімай песняй, пачутай ад матулі,— «Зорка Венера». Па спецыяльнасці (журналіст) не працаваў, уладкаваўся на па-

саду начальніка аддзела кадраў. Спачатку спяваў для матулі, пасля наведвалі яго канцэрты беларусы, украінцы, рускія ў Амерыцы, стаў вядомым на Беласточчыне, адкуль яго песні даляцелі і да нас.

Дзевятнаццацігадовым юнаком Багдан пазнаёміўся з Лявонам Барткевічам.

— Тады ўсе беларусы Нью-Йорка ведалі, што ў горадзе будуць гастролі «Песняроў». Калі ансамбль прыехаў, я пайшоў на сустрэчу з ім. Лявон бачыў мой дыск у кабінеце былога міністра культуры Міхневіча і пазнаў мяне.

З тае пары яны сябруюць. Па запрашэнню Данчыка Барткевіч правёў два тыдні ў ЗША. За гэты час яны выдалі сумесны дыск «Мы адной табе належым», які набыў шырокую вядомасць сярод беларусаў. Лявон пазнаёміў Данчыка з песнямі Сяржука Сокалава-Воюша. У час паездкі Багдана ў Савецкі Саюз яны былі ўтраіх амаль заўсёды — Данчык, Барткевіч, Воюш. Разам давалі канцэрты, і плануюць, і добрачынныя — на карысць Фонду культуры, у фонд Чарнобыля.

Ці спадабалася яму ў нас?

— Так. Праўда, на Украіне родная мова гучыць часцей, чым наша на Беларусі. Але я заўсёды знаходжуся ў беларускім асяроддзі і адчуваю сябе вольна. Непрыемнасць, з якой давялося сутыкнуцца,— ваша сфера абслугоўвання.

Скончылася падарожжа Данчыка на радзіму. Першае. Не паверу, што апошняе.

С. СЯНКЕВІЧ.

НА ЗДЫМКУ: Багдан Андрусышын (Данчык) на канцэрце ва універсітэце.



НА НЕКАЛЬКІ СЛОЎ

АД «БУФ» ДА «БІС»

Афіша паведамляла аб прыездзе ў сталіцу Беларусі шоу-групы «Біс» ленінградскага тэатра-студыі «Бенефіс», мастацкім кіраўніком якога быў названы заслужаны артыст РСФСР Міхаіл Баярскі.

Таму, заглянуўшы за кулісы, я пацікавіўся ў хлопцаў, што сядзелі на калідоры, дзе магу ўбачыць Баярскага.

— Не прыехаў,— адказалі мне і растлумачылі: — Ён — мастацкі кіраўнік «Бенефіса», а наш «Біс» — толькі адна яго трупа.

— Да пабачэння,— развітаўся я, накіроўваючыся да выхаду.

— А мы вас не цікавім? — пытанне ва ўпор павісла ў паветры.

Я пайшоў. Але пытанне не давала спакою. «А, магчыма, і сярод іх ёсць Баярскія?» — нарэшце, пераканаў я сябе, каб вярнуцца.

Прадстаўленне «Надзвычайнае здарэнне» адбылося і без М. Баярскага. Пяць артыстаў выконвалі эстрадныя шлягеры і рамансы, чыталі Хемінгуэя і Жванецкага, парадыравалі і расказвалі аб «Бенефісе» і «Бісе». Але... песні гучалі б лепш пры якаснай апаратуры. Гумар быў часам банальным, аднак здараліся і нядрэнныя рэпрызы. Не хапала палёту думкі і дзеяння, таму сцэна выглядала «не асвоенай». І ўсё ж недахопы з лішкам пакрываў малады запал.

Зразумела, многае залежыць ад настрою — я рыхтаваў сябе да тэатралізаванага прадстаўлення. Убачыў жа — эстрадны «капуснік». Пра гэта і пачалі гутарку з мастацкім кіраўніком шоу-групы «Біс» Георгіем ПІЦХЕЛАУРЫ.

— Каму належыць ідэя стварэння «Біса»?

— Тым, хто пачынаў: Вадзіму Караву, Генадзю Ткачэнку, Дзмітрыю Шумейку і мне. Працавалі ўчатырох у ленінградскім тэатры «Буф». Мы імкнёмся да сінтэтычных форм эстрады, таму што лічым: эстрадны акцёр не можа з'явіцца на сцэне, адпрацаваць нумар і пайсці — ён павінен выступаць ва ўсіх жанрах.

— Як адбылося «залічэнне» у тэатр-студыю «Бенефіс» — у яго складзе працуюць такія вядомыя артысты, як Валерый Лявонцеў, Ігар Скляр, Віктар Цой з групай «Кіно»?

— Гэта было ў Палацы моладзі — мы працавалі ад тэатра «Буф». А дырэктар «Бенефіса» шукаў там маладыя таленты, каб стварыць моцны «штат» сваёй групы.

— «Буф», «Біс». Што далей?

— Вельмі складана загадваць на будучае. Хацелася б стварыць сваю студыю. Зараз і жа рыхтуем музычны драматычны спектакль.

— А як жа з імем Баярскага на афішах? Не сакрэт, многія ішлі менавіта на яго.

— Калі я прапанаваў выкрасліць яго імя, Міхаіл запярэчыў: «Ні ў якім разе. Я хачу, каб людзі прывыклі да майго крыху незвычайнага творчага амплуа». Па-мойму, гэта зусім натуральна, таму што нават такі акцёр, як Міхаіл Сяргеевіч Баярскі, усё роўна павінен мець творчы рост. Зараз ён стварыў сваю тэатральную справу.

С. ШАПРАН.

НА ЗДЫМКУ: Генадзь Ткачэнка, Георгій Піцхелауры, Вадзім Караў, Вольга Дамушчу, Дзмітрый Шумейка — «Біс».

АНОНС

Трапіў я на вочы Градскаму ў самы нязручны момант: Аляксандр бегаў, нервавaўся. Яшчэ б! У час самага першага канцэрта ён узяў ноту такой высокай чысціні, што ў апаратуры спрацавала аўтаматычная сістэма засцярогі, нязвыклая да звышякаснага гуку. Замест перапынку была наладка. А тут з гэтым інтэрв'ю...

...якое вы прачытаеце ў наступным выпуску «Аўдыторыі № 7».

У «Аўдыторыі № 7» дзяжурыў Зміцер ЛУКАШУК.

ПРАЗ РАСЧЫНЕНЫЯ ДЗВЕРЫ

МАЙК НАВУМЕНКА І ЯГО ЗВЯРЫ

Ці ёсць рацыя прадстаўляць чытачам «Аўдыторыі № 7» ленінградскі «Заапарк» — гурт, які цвёрда трымаў сцяг рок-н-рола, калі той быў мёртвы, а мы — яшчэ не? Шмат што змянілася з тае пары, калі айчынных рокераў лаялі агулам і паасобку, але «Заапарк» здаецца мне савецкім «Статус Кво» у плане сваёй нязменнасці адносна плыняў моды і кан'юнктуры музычнага свету.

Аднак мяняюцца тыя, хто слухаў і слухае каманду Майка Навуменкі. Яшчэ пяць гадоў назад гэтыя песні апаціравалі — сёння іх можна аднесці да разраду ліберальнай, «мяккай» сатыры. Новыя маладыя рок-прамоўцы «перакрычалі» «Заапарк». Ці патрэбны ён каму-небудзь цяпер?

КАНЦЭРТ

На пачатку красавіка гэтага года некалькі дзён гурт дае канцэрты ў Мінску. Ясны марозны вечар. Выпадковых людзей у зале Палаца культуры тэкстыльшчыкаў амаль няма. Тут тыя, каму патрэбны менавіта ён, «Заапарк», на чале з нястомным Майкам. Як добра адладжаная машына, састаў на адным подыху выдае старыя свае рэчы ўперамежку з новымі. Публіка, якая складаецца зусім не з падлеткаў, адказвае ўдзячным шквалам апладысментаў і вар'яцкім свістам.

Пасля канцэрта крыху стомлены Майк здымае славутыя чорныя акуляры. Ад сцэнічнага іміджу застаецца хіба толькі яго чырвона-чорна-белы шалік. Здаецца, Майк проста перарос юнацкі ажыятаж вакол «людзей з рока» і ніяк не адчувае сябе «зоркай». Наша размова кранае не толькі «Заапарк». Мяне цікавіць наогул рок праз успрыманне таго, хто амаль ужо ўвайшоў у яго гісторыю.

«РОКСІ»

Міхаіл (Майк) Навуменка.

Дата нараджэння: 18 красавіка 1955 г.

Колер вачэй — кары.

Колер валасоў — шатэн.

Хобі — збіранне матэрыялу пра Марка Болена.

Любімы колер — насычаны цёмна-сіні.

Любімы гурт — «Акварыум».

Любімыя захапленні: чытанне заходняй прэсы (музычнай) і айчынных дэтэктываў 40—50-х гадоў, здача пустых бутэлек.

Асабістыя непрыязнасці: дурныя дзяўчаты, дурныя хлопчыкі, тушаная капуста.

Прафесійная мэта — іграць і запісваць тую музыку, якая падабаецца.

ГРЫМЁРНАЯ

У акно «грымёрнай» смела зазірае сонца. Праз некалькі гадзін пачнецца канцэрт. Гітара і клавішы яшчэ ў футарале. У гутарцы ўдзельнічаюць усе музыканты: Ілля Кулікоў (бас-гітара), Аляксандр Храбуноў (лідэр-гітара), Валерый Кірылаў (ударныя). Пастаянна ўмешваецца Сева Грач (нязменны адміністратар).

— Майк, калі ты першы раз узяў у рукі гітару?

— Гадоў у чатырнаццаць-пятнаццаць. Бабуля купіла мне гітару пасля доўгіх патрабаванняў. Тады героямі нумар адзін усяго майго пакалення былі «Бітлз».

— А «Ролінг Стоўнз»?

— «Стоўнз» — гэта зусім іншая музыка, настолькі ж крутая, але была яна крыху пазней, недзе ў семідзесятым годзе.

— Як наогул сабраўся састаў?

— Барабаншчыка параіў мне Міхаіл Васільеў з «Акварыума», але спачатку мы пазнаёміліся з Іллёй Куліковым у гасцях у майго прыяцеля, паспрабавалі іграць удваіх. Потым з'явіўся барабаншчык Андрэй Данілаў. Ён іграў у інстытуцкім гурце разам з гітарыстам. Мы іх адтуль проста выкралі.

— З якога часу гурт можна лічыць «Заапаркам»?

Сева ГРАЧ:З лютага 1981-га.

— Майк, ты ўчора называў ленінградскія гурты «Нуль», «Небяспечныя суседзі», «Час кахаць». А сярод замежных выканаўцаў хто табе больш падабаецца?

— Зараз іх развялася такая страшэнная колькасць, што пра ўсіх не пачуеш. З апошніх альбомаў мне вельмі спадабаўся сольнік Кіта Рычарда і «Топез Чыф»...

— Які далейшы лёс рока ў СССР?

— Яму столькі разоў прадказвалі смерць, а ён жывы і здаровы. Ён мяняецца, ён ідзе цыкламі.

— Ці ўплываюць на рок розныя арганізацыі, аб'яднанні?

С. Г.: Рок-клубы — уплываюць.

— Яны розныя. Ленінградскі рок-клуб і маскоўская рок-лабараторыя — абсалютна не падобныя. Усё залежыць ад таго, хто ўваходзіць у рок-клуб, што людзі робяць, якія паміж імі адносіны. У нас у рок-клубе ўсё добра, а ў Маскве вельмі любяць лаяцца адзін з адным, бывае, нават пішуць даносы.

— Майк, ты ўяўляеш сябе ў сорак гадоў з гітарай?

— Кіту Рычарду зараз сорак пяць — і будзьце ласкавы!

— А ці гатовы матэрыял для вашага новага альбома?

— Па вушы. Яго хапае на два альбомы «Заапарка». І на адзін мой сольны. Справа ў студыі. У годзе 1984—1985-м можна было запісвацца ва ўмовах, так скажам, хатніх: два двухдарожкавыя магнітафоны з перакідам з аднаго на другі. Зараз мы хочам выпусціць запіс, які адпавядаў бы стандартам калі не сусветным, то, па меншай меры, унутрысаюзным. А ў добрай студыі атрымаць час, які б нам падыходзіў, даволі цяжка.

С. Г.: І даволі дорага.

ДЫСКАГРАФІЯ

У «Заапарка», не, хутчэй у Майка, прынята налічваць шэсць альбомаў.

1. «Усе браты-сёстры», 1978, акустычныя песні Майка і Боба.
2. «Салодкая Н і іншыя», 1980, сольны, акустычны.
3. «Маскоўскі блюз», 1981.
4. «55», сольны, 1982.
5. «Павятовы горад», 1983.
6. «Белая паласа», 1984. Яго скарочаны варыянт выпусціла «Мелодыя».

АДНОСІНЫ

— У Ленінградзе шмат бліскучых музыкантаў. Гавораць, што некаторыя з іх часам выступаюць разам у курохінскай «Поп-механіцы». Дарэчы, ці запрашаў вас Курохін у сваё грандыёзнае шоу?

С. Г.: Бачыш, у чым справа, ён запрашае тых, хто трапляецца пад руку, хто тусуецца. А «Заапарк» — самы нетусовачны гурт.

— «Акварыум», здаецца, таксама?

— Як сказаць. З усяго нашага калектыву ў тым жа рокклубе часта бываю толькі я, мне гэта трэба па рабоце. Ну, а з «Акварыумам» Курохін працуе пастаянна.

— Як ты ставішся да «Сакрэта», які выконвае некалькі песень «Заапарка»?

— Чаму добрым людзям не спяваць добрыя песні?

— А да «Міцькоў»?

— Мы любім адзін аднаго.

— Ці даўно ты знаёмы з Пятром Мамонавым («Гукі Му»)?

— З 80-га. Гераічны чалавек. І ў «Іголцы» здорава выканаў сваю ролю, лепш, чым Цой...

— Дарэчы, ці запрашалі калі-небудзь «Заапарк» у кіно?

С. Г.: Запрашалі, у прыватнасці, у стужку «Узломшчык». Але мы здымаліся толькі ў фільме Рашыда Нугманава «Йа—хха». Гэта была яго дыпломная работа. Чорна-белая стужка. Але гэты чалавек — ён наш, разумееш? У адрозненні ад Вучыцеля (рэжысёра фільма «Рок» — Д. С.). Вучыцель — прафесіянал, але ён здымаў звонку. Ён зняў, скажам, тыя гурты, якія былі ў той абмежаваны час у Ленінградзе. Гэта кан'юнктура. Погляд чалавека, які сам не жыве ў гэтым коле. А «Йа-хха» — даследаванне знутры. Можна гаварыць ці не гаварыць пра агрэхі, але гэта вельмі здорава.

— Фільм «Рок» — гэта тое ж самае, як калі б я, напрыклад, пачаў здымаць фільм пра ядзерную энергетыку або пра класічны балет. Там добры аператар Дзіма Мас, але... адзінае, чым можна пахваліцца,— кадры, дзе іграе «ДДТ» і паказаны натоўп. Справа ў тым, што натоўп гэты радаваўся, гледзячы на нас...

— А які быў самы вясёлы канцэрт за апошні час?

— Другога сакавіка ў ленінградскім цырку, разам з гуртам «Нуль». Да гэтага мы даўно не іграл ў Ленінградзе. Добра атрымалася.

— Майк, а ў цябе ёсць сям'я?

— У мяне жонка і сын. Сыну ўлетку будзе восем.

— Якія пытанні ты не любіш?

— Чаму гурт называецца «Заапарк» і што я пішу спачатку: словы ці музыку.

— Ты вельмі маўклівы на сцэне. А што б хацеў сказаць публіцы, акрамя песень?

— Думаю, не так ужо шмат. Наша справа — не гаварыць, наша справа — музыку іграць.

Д. СТАНЮТА.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
7 снежня
Зак. 1639.
Т. 2000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.